Падтрымай "Вясну" на PATREON

# Алесь Круткін арыштаваны на 15 сутак за ўдзел у акцыі за незалежнасць

дапоўнена

29.01.2020 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, затрыманні



Алесь Круткін. Фота са старонкі ў фэйсбуку.

У панядзелак 27 студзеня супрацоўнікі міліцыі затрымалі двух актывістаў грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь". **Алеся Круткіна і Наталлю Спірыдонаву** даставілі ў РАУС Кастрычніцкага раёна Віцебска, дзе абвінавацілі ў расклейцы ўлётак, якія з'явіліся раней у цэнтры горада.

Як паведаміла Наталля Спірыдонава, на іх склалі пратаколы па артыкуле 17.1 КаАП. Пасля складання пратаколу ў Кастрычніцкім РАУС актывістку адвезлі ў Першамайскі РАУС, дзе на яе быў складзены другі пратакол па артыкуле 21.14 КаАП.

Наталлю Спірыдонаву вызвалілі праз тры гадзіны пад падпіску ў сувязі з тым, што ў яе на ўтрыманні знаходзіцца маці-інвалід. Алесь Круткін пасля афармлення пратакола адпраўлены ў ІЧУ да суда. Пратакол па 17.1 КаАП быў складзены старэйшым інспектарам Кастрычніцкага РАУС маёрам міліцыі **Юрыем Васіленкам.** Пратакол па 21.14 КаАП склаў старшы ўчастковы, маёр міліцыі **Уладзмір Казлоўскі.**

На наступны дзень, 28 студзеня, у судзе Кастрычніцкага раёна горада павінны былі прайсці суды над актывістамі, паведамляе "Еўрапейская Беларусь". Да пачатку судовых пасяджэнняў актывістамі былі заяўленыя хадайніцтвы: Наталля Спірыдонава хадайнічала аб перакваліфікацыі артыкула 17.1 КоАП на 21.14.2 КаАП, Алесь Круткін - пра адваката. Абодва хадайніцтвы задаволеныя. У выніку абодва судовыя паседжаньні былі перанесены.



## Наталлю Спірыдонаву аштрафавалі за пікет і пачалі судзіць за расклейванне налепак

28 студзеня ў судзе Чыгуначнага раёну Віцебску актывістку «Еўрапейскай Беларусі» Наталлю Спірыдонаву аштрафавалі на 25 базавых велічынь за ўдзел у снежаньскім антыінтэграцыйным пікеце на плошчы Перамогі. У гэты ж дзень у судзе Кастрычніцкага раёну яна разам з полацкім актывістам Алесем Круткіным стала фігуранткай іншай адміністрацыйнай справы.

Пасля гэтага актывістаў даставілі ў РАУС Кастрычніцкага раёна Віцебска. Наталлі Спірыдонавай ўручылі позву, а Алеся Круткіна вязуць у Полацк, дзе яго чакае суд за ўдзел у акцыі ў Мінску 20 снежня.

Увечары 28 студзеня стала вядома, што Алесь Круткін атрымаў 15 сутак арышту за ўдзел у акцыі ў падтрымку незалежнасці 20 снежня. Суд прайшоў у судзе Полацкага раёна ў закрытым рэжыме, паведамляе "Еўрапейская Беларусь".

---

***Навіны ад Spring96.org у Telegram. Падпішыся на наш канал https://t.me/viasna96***

Твитнуть




## СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"



#ВолюВясне



ПАЛІТЫЧНЫЯ ЗНЯВОЛЕНЫЯ

Спіс палітычных вязняў

## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брасце і Віцебску пасля рэйда па сяброўках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

## Рэферэндум 2022



ВЫДАННІ






## ПАРТНЁРСТВА

Радыя

Kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

Вытокі

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская Группа

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO
European Network of Election Monitoring Organisations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY